*Басава Г.І., Салаўёў П.Л.*

# МЕСЦА І РОЛЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ “МАЎЛЕНЧАЯ КАМУНІКАЦЫЯ” Ў СІСТЭМЕ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПА ПРАГРАМЕ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ “КАМУНІКАЦЫЯ Ў СФЕРЫ ГРАМАДСКІХ СУВЯЗЕЙ”

Маўленчая камунікацыя ў наш час паўстае і яе асобны навуковы кірунак, і як самастойная вучэбная дысцыпліна, якая валодае ўласным паняційным апаратам. Некаторыя даследчыкі ўключаюць маўленчую камунікацыю ў якасці аднаго з цэнтральных блокаў мадэлі тэорыі камунікацыі і прапануюць яе даследаванне ў межах камунікатывістыкі (камунікалогіі) (гл., напрыклад, [2]).

Сучаснае разуменне маўленчай камунікацыі не засяроджваецца выключная на “маўленчым” аспекце, а аперыруе такімі тэрмінамі як камунікатыўнае ўздзеянне і ўзаемадзеянне, уключае не толькі вербальныя, але і невербальныя, паравербальныя, экстралінгвістычныя аспекты камунікацыі. Вывучэнне маўленчай камунікацыі ў якасці самастойнай дысцыпліны прадугледжвае таксама веданне і валоданне асноўнымі формамі і відамі маўленчай дзейнасці, засваенне норм літаратурнай мовы, веданне асноў маўленчага этыкету, магчымасць пабудаваць выказванне з улікам умоў сітуацыі маўлення, веданне псіхалагічных механізмаў чалавечага узаемадзеяння.

У сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў па праграме павышэння кваліфікацыі “Камунікацыя ў сферы грамадскіх сувязей” слухачам прапануецца вывучэнне дысцыпліны **“**Маўленчая камунікацыя”, мэтай якой з’яўляецца навучыць слухачоў максімальна эфектыўна выкарыстоўваць асаблівасці маўленчай камунікацыі з улікам псіхалагічнага, дзейнаснага, арталагічнага аспектаў, а таксама аспекту камунікатыўнага ўзаемадзеяння.

У межах дысцыпліны слухачам прапануецца азнаёміцца з асноўнымі паняццямі маўленчай камунікацыі, функцыямі мовы і маўлення,

перцэптыўнымі (слуханне, чытанне) і рэцэптыўнымі (маўленне, пісьмо) відамі маўленчай дзейнасці, уводзяцца паняцці моўнай і маўленчай (камунікатыўнай) кампетэнцыі, разглядаюцца фактары паспяховасці камунікатыўнага працэсу, правілы паспяховай камунікацыі, праводзіцца тыпалогія камунікатыўных няўдач. Маўленчая камунікацыя разглядаецца як працэс, уводзіцца паняцце маўленчага акта, праводзіцца іх тыпалогія, разглядаюцца розныя мадэлі камунікатыўных актаў.

Вывучэнне дысцыпліны “Маўленчая камунікацыя” прадугледжвае таксама разгляд камунікатыўных стратэгій і тактык маўленчых паводзінаў. Разглядаюцца стратэгіі інфармавання, пераканання, унушэння, пабуджэння, уводзіцца паняцце кааператыўных і некааператыўных стратэгій, канфлікт разглядаецца як вынік выбару няправільнай камунікатыўнай стратэгіі (тактыкі), разглядацца найбольш тыповыя стратэгіі і тактыкі маўленчых паводзінаў у сітуацыі канфлікту.

Маўленчае ўзаемадзеянне ў межах вывучэння дысцыпліны “Маўленчая камунікацыя” разглядаецца ў непарыўнай сувязі з фактарамі эфектыўнасці камунікацыі, праводзіцца тыпалогія мэтаў камунікацыі (інфармацыйная, прадметная, камунікатыўная), уводзіцца паняцце захавання “камунікатыўнай раўнавагі” [3].

Асаблівая ўвага надаецца вывучэнню маўленчай камунікацыі з пункту гледжання этычных перспектыў камунікатыўнага ўздзеяння ў маркетынгу, рэкламе, сувязях з грамадскасцю. Уводзяцца паняцці этычных каштоўнасцей, абмяркоўваецца “этычнасць” прапаганды, нейралінгвістычнага праграмавання і інш.

Каштоўнасць дысцыпліны “Маўленчая камунікацыя” ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў па камунікацыі ў сферы грамадскіх сувязей абгрунтоўваецца яе комплексным міждысцыплінарным характарам, разнастайнасцю метадалагічных падыходаў да вывучэння маўленчай камунікацыі, шырынёй кола разглядаемых пытанняў.

Пасля вывучэння дысцыпліны “Маўленчая камунікацыя” слухачы павінны ўмець размяжоўваць розныя віды маўленчай дзейнасці, выкарыстоўваць адпаведныя мэце і сітуацыі маўлення камунікатыўныя стратэгіі і тактыкі, выяўляць прычыны камунікатыўных няўдач ў розных маўленчых сітуацыях, выкарыстоўваць карэктныя метады і прыёмы аргументацыі і пераканання, выконваць этычныя нормы маўленчай камунікацыі.

Эфектыўнаму засваенню дысцыпліны “Маўленчая камунікацыя” павінна спрыяць выкарыстанне элементаў сістэмы кіравання навучаннем (віртуальнага навучальнага асяроддзя) Moodle (падрабязней гл. [1]), што дазваляе значна паскорыць тэмп засваення вучэбнага матэрыялу, а таксама інтэнсіфікаваць і павысіць эфектыўнасць самастойнай работы слухачоў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**


1. Басава, Г.І. Інтэнсіфікацыя вучэбнай камунікацыі з дапамогай элементаў «blended learning» у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў сродкаў масавай камунікацыі / Г.І. Басава, П.Л. Салаўёў // Журналістыка-2012: стан, праблемы і перспектывы : мат-лы 14-й Міжнар. навук.-практ. канф., 6 –7 снежня 2012 г., Мінск. – Вып. 14. – Мінск: БДУ, 2012. – С. 112–114.
2. Гойхман, О.Я. Коммуникативистика в современном обществе / О.Я. Гойхман // НИР. Современная коммуникативистика. – 2012. – №1 (1). – С. 4–9.
3. Стернин, И.А. Введение в речевое воздействие / И.А. Стернин. – Воронеж: Кварта, 2001. – 252 с.